является формой внеценовой конкуренции (естественно при исключении стратегии промоцены). Ее значение для производства зависит от различных факторов, среди которых к наиболее важным принадлежат намерения производства по отношению к данному рынку, конкуренция на рынке, характер рынка, вид и качество продаваемых товаров, степень внедрения продукта на рынок, отношение покупателя к товарам данного производителя. [15]

Конкуренция, изменение стиля жизни, возраста, достатка, миграция являются причиной постоянных количественных и качественных изменений в структуре клиентов каждого магазина. Чтобы промоция принесла желаемые результаты, необходимо определить ее цели, запланировать эффекты, которые мы хотим достигнуть в результате промодействий. В зависимости от фирмы, ее финансовой и организационной ситуации и позиции на рынке, цели эти могут быть весьма разнообразными.

### СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ


1. E. Przydatek, J. Przydatek, *Promocja,* WsiP, Warszawa 1999, s.76.
2. J. Bielski, *Efektywna sprzedaż czyli 21 stopni do sukcesu*, Bydgoszcz 1986, s.9.
3. L. Garbarski, J. Rutkowski, W. Wrzosek, *Marketing,* PWE, Warszawa 1995, s.41.
4. E. Przydatek, J.Przydatek, *Promocja...*, s.111.
5. Там же, стр. 111.
6. Koźmiński, W. Piotrowski, *Zarządzanie. Teoria i praktyka*, PWE, Warszawa 1996, s.191.
7. Т. Крамер в цикле жизни продукта выделяет 4 фазы. См. T.Kramer, *Podstawy marketingu,* PWE, Warszawa 1997, s.99.
8. Там же, стр.98.
9. Там же.
10. J. Altkorn, op. Cit., s.133.
11. J. Altkorn, op.cit., s. 133.
12. L. Garbarski, J.Rutkowski, W.Wrzosek, op.cit., s. 101.
13. T.Kramer, Podstawy..., s. 101
14. E. Przydatek, J. Przydatek, op.cit., s. 79.
15. Sznajder, *Sztuka promocji*, PWE, Warszawa 1993, s. 41.


УДК 37.013.46

***Кавалевіч М.С.***

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ ДЭТЭРМІНАНТЫ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМЫ ПРАФЕСІЙНАГА САМАВЫЗНАЧЭННЯ

Праблема выбару чалавекам сферы прафесійнай дзейнасці мае светапоглядны характар, паколькі, з філасофскага пункту гледжання, ляжыць на скрыжаванні, ахоплівае тры асноўныя сілы чалавечага грамадства: сілу асобы, сілу спосабаў камунікацыі і сілу арганізацыі сумеснага жыцця. Пералічаныя ўтварэнні прадстаўлены (адпаведна): духоўнай культурай, якая ўтварае асяроддзе зносін з вядучай сферай "Я", тэхнікай як другой прыродай і асяроддзем пражывання сучаснага чалавека, а таксама грамадствам, што складае асяроддзе самаадчування з вядучай сферай "Другі"[ 1, с.17-28]. Усе абазначаныя сілы, утвораныя імі асяроддзі праяўлення і сферы прадстаўленасці ўзаемазвязаны і ўзаемаабумоўлены. Недзіўна пагэтаму, што праблемы выбару чалавекам прафесіі сацыякультурна абумоўлены, а, значыць, па-рознаму разглядаліся і вырашаліся на розных этапах грамадскага развіцця. У якасці асноўнага крытэрыю , які вызначаў фарміраванне падыходаў да вырашэння абазначанай праблемы, выступалі суадносіны паміж дзвюма, у многім палярнымі, сіламі: асобай і грамадствам, а дакладней іх патрэбамі і інтарэсамі.

Сучасны перыяд развіцця тэорыі і практыкі арганізацыі прафесійнага выбару адпавядае пераходнаму этапу цывілізацыйнага развіцця — ад індустрыяльнага да постіндустрыяльнага грамадства. Дадзеныя абставіны абумовілі неабходнасць перагляду падыходаў да вырашэння цікавячай нас праблемы ў сувязі з непазбежнай зменай дэтэрмінуючых іх сацыякультурных арыенціраў.

Для адыходзячага індустрыяльнага этапа грамадскага развіцця з дакладнай арыентацыяй на масавую адукацыю былі характэрны такія рысы як перавага універсальнага над лакальным і прыярытэт іструментальных, каштоўнасцяў, што рэгламентавалі паводзіны і дзейнасць [9, с.3-27]. Менавіта гэтыя асаблівасці вызначылі спецыфіку тэорыі і практыкі кіраўніцтва прафесійным выбарам выпускнікоў школ і праявіліся ў адавочным прыярытэце грамадсіх патрэб над асобаснымі.

Аналіз псіхолага-педагагічнай літаратуры тых гадоў паказаў, што пры даследаванні праблемы прафесійнай арыентацыі амаль усе аўтары зыходзілі з пазіцый неабходнасці ў забеспячэнні народнай гаспадаркі кадрамі. Перавага аддавалася патрэбам дзяржавы перад патрэбамі асобы. Даследчыкі зыходзілі з канцэпцыі грамадскага інтарэсу як галоўнага стымулу пры прафесійным вызначэнні. Вучні пры гэтым выступалі як аб`екты кіравання ў адпаведнасці з мэтамі і патрэбамі сістэмы. Свабода прафесійнага самавызначэння амаль поўнасцю ігнаравалася.

Інтарэсы і патрэбы асобы падпарадкоўваліся патрабаванням індустрыяльнага грамадства, галоўнае месца ў якім займалі вытворчыя тэхналогіі. Іх безумоўны прыярытэт знаходзіў адлюстраванне ў пабудаванні сацыяльнай арганізацыі па тэхналагічнаму прынцыпу і нават у атоесамліванні працэсаў тэхналагічнай вытворчасці і фарміравання свядомасці [9, с.3-27].

Тэхналагічны падыход быў пакладзены і ў аснову прафарыентацыйнай работы. Сутнасць такога падыходу: "Чалавек для грамадства, для дзяржавы", чалавек – вінцік у складаным гаспадарчым механізме, выканаўца, работнік, "кадр". На ўмовах чалавечага фактару ён павінен быў выконваць сверхмэты – забяспечваць высокія тэмпы навукова-тэхнічнага прагрэсу ў эпоху навукова-тэхнічнай рэвалюцыі. "Зарыентаваць іх (выпускнікоў – М.К.) на працу перш за ўсё ў галінах народнай гаспадаркі, найбольш важных для эканомікі краіны і адчуваючых патрэбу ў кадрах, загадзя прадумаць пытанне аб іх прафесійнай падрыхтоўцы – задача дзяржаўная. Пры яе вырашэнні трэба зыходзіць з патрэб вытворчасці", – пісаў тагачасны міністр асветы СССР М.А. Пракофьеў [6, с.30].

У тагачаснай Пастанове ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР адзначалася: "Ва ўмовах усеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі цяперашняя пастаноўка працоўнага навучання, выхавання і прафесійнай арыентацыі не адпавядае ўзрослым патрабаванням вытворчасці і навукова-тэхнічнага прагрэсу. Многія выпускнікі школ уступаюць у жыццё без належнай працоўнай падрыхтоўкі, не маюць дастатковага

***Ковалевич Мария Степановна***, *канд. пед. наук, зав. каф. педагогики детства Брестского государственного университета им. А.С. Пушкина.*
*Беларусь, БрГУ, 223065, г. Брест, бульвар Космонавтов, 21.*

ўяўлення аб асноўных масавых прафесіях і адчуваюць цяжкасці пры пераходзе на працу ў народную гаспадарку" [5, с.8]. Было прызнана, што неабходна палепшыць падрыхтоўку моладзі да працы ў сферы матэрыяльнай вытворчасці.

У змест адукацыі былі ўключаны вынікі НТП. Была павялічана колькасць гадзін на вывучэнне прыродазнаўчых дысцыплін за кошт гуманітарных. У выніку такой дэгуманізацыі вучэбны працэс страціў выхаваўчыя асобасныя аспекты свайго існавання. Гуманітарныя веды паступова падмяняліся навукова-тэхнічнымі, вузка прафесіянальнымі. НТП абярнуўся сацыяльна-культурным рэгрэсам. Асоба пераўтваралася з асноўнага рухавіка культуры ў сродак вырашэння эканамічных і тэхнічных задач [7, с. 36-48]. Прафесіянальная арыентацыя разглядалася як спецыфічны кампанент механізма сацыялістычнага размеркавання сукупнай рабочай сілы па разнастайных сферах грамадскай вытворчасці. "Тэхнічны вытворчы апарат стаў таталітарным у такой ступені, што вызначаў не толькі сацыяльна неабходныя прафесіі, уменні, устаноўкі, але таксама індывідуальныя патрэбы і чаканні" [4, с. 147]. Так званая сфарміраваная асоба пераўтварылася ў наяўнасць таго, хто яе сфарміраваў, у аб'ект кіравання і маніпуляцый. Поўнасцю ігнаравалася старажытная ісціна, вядомая яшчэ Бл. Аўгусціну, што асоба нараджаецца пры рашэнні экзістэнцыяльнай задачы засваення і авалодання складанасцю асабістага быцця.

Маладыя людзі падпарадкоўваліся палітычным рашэнням і цэлымі класамі ішлі ў калгас, паднімалі цаліну. Жанчыны садзіліся за штурвал трактара, камбайна, касмічнага карабля, працавалі труба- або шпалаўкладчыкамі. Здзейсніўшы неадэкватнае прафесійнае самавызначэнне, не рэалізаваўшы свой прафесійны ідэал, малады чалавек глядзеў на сваё працаўладкаванне як на няўдачу, як на правал асабістых планаў, працаваў без цікавасці. Адсутнасць схільнасцяў да выбранай прафесіі не выклікала ў чалавека імкнення да павышэння прафесіяналізму. Часта ў такім выпадку пачыналіся працяглыя пошукі "сваёй" прафесіі, што дорага абыходзілася і дзяржаве, і асобе. Незадаволенасць прафесіяй з'яўлялася галоўнай прычынай дэперсаналізацыі асобы, страты сэнсу ўласнай дзейнасці. "Не ведаючы таго, што яму (чалавеку) трэба, ні таго, што ён павінен, чалавек, здаецца страціў яснае ўяўленне аб тым, чаго ж ён хоча. У выніку ён або хоча таго ж , чаго іншыя (канфармізм), або робіць тое, што іншыя хочуць ад яго (таталітарызм) [10, с. 25]. Чалавек, які не знайшоў сэнсу ў жыцці, не толькі не шчаслівы, але і не жыццяздольны. Таму "… чалавечая годнасць не павінна дазваляць людзям самім выступаць сродкамі здзяйснення чаго-небудзь, станавіцца простымі прыладамі працоўных працэсаў, дэградыраваць да выканання функцый сродкаў вытворчасці" (Там сама, с. 240).

Ужо ў другой палове XX стагоддзя сталі відавочнымі заганы індустрыяльнага грамадства як прадукта навукова-тэхнічнага прагрэсу. У найбольшай ступені на працэсах прафесійнага выбару адлюстраваліся такія негатыўныя з'явы як уніфікацыя асобы і амаль поўная яе залежнасць ад сацыятэхнічнай сістэмы, што прапаведвала "культуру карыснасці", у адпаведнасці з пастулатамі якой карысны эфект ацэньваецца без клопатаў пра якасць жыцця і індывідуальнасць чалавека. Аднак тэхнакратычнае мысленне, што дамінавала на гэтым этапе грамадскага развіцця, заставалася непахісным. Дамінаваў погляд на чалавека як на запраграмаваны кампанент сацыятэхнічнай сістэмы, аб'ект разнастайных маніпуляцый. Прыведзеныя абставіны выклікалі канфлікт паміж жаданым і рэальным, які адлюстраваўся на грамадскай практыцы таго часу.

Па энерцыі дэклараваўся тэзіс аб росце працоўнай актыўнасці, а яна прыкладна з канца 80-х гадоў пачала зніжацца, чалавечыя патрэбы падмяняліся дзяржаўнымі інтарэсамі, якія фактычна эксплуатавалі чалавечыя магчымасці. Вытворчасць была зарыентавана на вытворчасць, а не на чалавека і яго развіццё. Ініцыятыва была паралізавана, прафесійная самарэалізацыя часта станавілася немагчымай, выхады на высокія ўзроўні самаразвіцця не падтрымліваліся.

Вучоныя прапаведавалі канцэпцыю грамадскага інтарэсу як галоўнага стымулу ў рабоце, згодна з якой асабістае і грамадскае поўнасцю супадаюць пры сацыялізме. Практыка ўсё больш выяўляла імкненне да індывідуальнай і кааператыўнай форм працоўнай дзейнасці. Тэорыя сцвярджала, што магчымасці для праяўлення працоўнай ініцыятывы пашыраюцца, пры гэтым ссылалася на вялікую колькасць пачынаў, а на самой справе мы сутыкнуліся са з' явай, якая атрымала назву "імітацыя працы". У таталітарным грамадстве дзейнічаў пратэкцыянізм, наменклатурны падыход і класавы прынцып падбору і растаноўкі кадраў. Яны разбурылі прэстыж адукаванага чалавека, прынізілі ролю прафесіяналізму, значэнне спецыялістаў [3, с. 75].

Тэарэтычна распрацоўваліся натхняючыя палажэнні: "праца як галоўная форма быцця чалавека", "праца як вобраз жыцця людзей", а практычна ўсё менш маладых людзей імкнуліся пагрузіцца ў гэтае "прыгожае быццё", узяць за эталон працоўны вобраз жыцця, усё больш паяўлялася людзей з непрацоўнымі даходамі, "двайной мараллю". Востра стаяла праблема цякучасці кадраў. Прычым, 70-80% "цякучага кантынгенту" – рабочыя ва ўзросце 30 гадоў і болей, з іх 30-40% - да 20 гадоў]. Агульныя страты па прычыне цякучасці кадраў па краіне па дадзеных НДІ працы складалі каля 5 млрд. руб. у год. Калі толькі 1/5 частка гэтых страт узнікае з-за неадпаведнасці характару працы магчымасцям і схільнасцям працоўных, то і ў такім выпадку страты складуць 1 млрд.руб.[8, с.34-35]

Для ліквідацыі апісаных з`яў і была наладжана адпаведная сістэма прафесійнай арыентацыі. Але яна не спраўлялася з ускладзенымі на яе задачамі, паколькі метадалагічна грунтавалася на губляючым сілу палажэнні аб прымаце грамадства і дзяржавы над асобай.

У такіх сацыяльна-эканамічных умовах прафесійная арыентацыя разглядалася як працэс неабходнага і магчымага кіраўніцтва асобай, як сістэма, рэзультатыўнасць якой вызначалася ўзроўнем забеспячэння народнай гаспадаркі краіны высокакваліфікаванымі кадрамі. Дзеянне гэтай сістэмы прафесійнай арыентацыі знаходзілася ў прамой і неабходнай прычыннавыніковай сувязі з сацыяльным заказам грамадства, які праз многія каналы дэтэрмінуе функцыі кожнага структурнага падраздзялення сістэмы, кожнага элемента.

Для ажыццяўлення гэтых мэтаў была распрацавана спецыяльная тэхналогія прафесійнай арыентацыі, якая ўключала прафесійную інфармацыю, прафесійную кансультацыю і прафесійную адаптацыю. Прафесійная інфармацыя набыла характар прафесійнай прапаганды і прафесійнай агітацыі. Такая сістэма прафарыентацыйнай работы дазваляла праграмаваць паводзіны маладых людзей і кіраваць іх фарміраваннем. Школьнікам давалі звесткі пра найбольш масавыя прафесіі, у якіх у дадзены момант, у дадзеным эканамічным раёне была найбольшая патрэба, агітуючы на паступленне ў непрыстыжныя ПТВ. Прапагандысты расказвалі не аб сутнасці прафесій, іх патрабаваннях да асобасных якасцяў, ведаў будучага прафесіянала, здароўя, а аб рамантыцы навучання ў вучылішчы, мастацкіх гуртках, спартыўных секцыях, добрай сталоўцы ў вучылішчы.

Прафесійнае выхаванне было мэтанакіраваным уздзеяннем грамадства на прафесійнае самавызначэнне моладзі, фарміраванне патрэбнага грамадству чалавека. З дапамогай фарміруючай прафесійнай кансультацыі здзяйснялася карэкцыя выбару.

У такой сістэме прафесійнай арыентацыі вялікую ролю мела адаптацыя паколькі часта малады чалавек не быў гатовы да прапанаванай яму прафесійнай дзейнасці, не ведаў аб яе складанасцях і патрабаваннях, не ведаў або не даацэньваў

сваіх магчымасцяў або недахопаў, не ўмеў зарыентавацца ў сваіх здольнасцях і матывах выбару. У сувязі з гэтым прапаноўвалася стварыць усе ўмовы для прывыкання, адаптацыі маладога арганізма да складаных, часта нечалавечых умоў жыцця.

Асаблівая ўвага надавалася фарміраванню ідэйных асноў прафесійнай арыентацыі, якасцяў, неабходных для авалодання прафесіяй у адпаведнасці з патрэбамі канкрэтнага эканамічнага раёна. Фарміраваліся камуністычныя адносіны да выбару прафесіі з улікам неабходнасці авалодання спецыяльнасцю, якая мае першаступеннае значэнне для развіцця народнай гаспадаркі дадзенага эканамічнага раёна. Такім чынам рэалізавалася сацыяльная і эканамічная функцыі прафесійнай арыентацыі. Псіхолага-педагагічная і медыка-фізіялагічная толькі дэклараваліся.

Прафесійная арыентацыя была пабудавана на рэпрадуктыўным засваенні інфармацыі аб свеце прафесій, патрэбе ў кадрах, дыягностыцы інтарэсаў і схільнасцяў, карэкцыі прафесійных планаў. З этапаў прафесійнай арыентацыі найбольшае значэнне набыла прафесійная інфармацыя. Метады прафесійнай арыентацыі – у асноўным тлумачальна-ілюстратыўныя і рэпрадуктыўная проба сіл. Часцей за ўсё ўяўленні пра свет прафесій ніяк не суадносіліся з пазнаннем сябе, сваіх магчымасцяў. Адсутнасць індывідуальнага падыходу, уліку пазнавальных інтарэсаў дзяцей і моладзі адлюстраваліся ў аднастайнасці відаў і тыпаў вучэбных устаноў, у выкарыстанні ў асноўным інфармацыйных, а не развіваючых метадаў навучання. Асобныя школы і класы з паглыбленым вывучэннем прадметаў, шматлікія спецкурсы істотна не мянялі уніфікаваны вучэбна-выхаваўчы працэс, які быў зарыентаваны на сярэдняга вучня. У многіх выпадках прафесійнае самавызначэнне ажыццяўлялася інтуітыўна або “за кампанію”, дапускаліся і іншыя памылкі:

- арыентацыя адразу на прафесію сярэдняй або вышэйшай кваліфікацыі;
- прадузятасць у адносінах да прэстыжнасці або непрыстыжнасці прафесій;
- перанос адносін да чалавека – прадстаўніка той ці іншай прафесіі на саму прафесію;
- захапленне толькі знешнім або прыватным бокам прафесіі;
- атоесамліванне вучэбнага прадмета з прафесіяй [3, с. 74].

Гэта быў час аўтарытарнай тэхнакратычнай педагогікі ў рамках якой самавызначэнне асобы не мыслілася без жорсткага кіраўніцтва вучнямі і было зведзена да фарміравання неабходных грамадству “функцыянальных” людзей – выканаўцаў, адаптаваных да жыцця ў дадзеных грамадскіх умовах і падрыхтаваных да выканання пэўных сацыяльных роляў. У аснову тэхнакратычнай педагогікі пакладзены ідэі Б.Скінэра, які стварыў спецыяльную навуку пра “тэхналогію паводзін”, што дазваляе праграмаваць паводзіны людзей і кіраваць іх фарміраваннем.

Вытокі такога падыходу ў “Вялікай дыдактыцы” Я.А. Каменскага, тэорыі і методыцы дакладнага праектавання асобы, рэалізацыі пастаўленых мэтаў. Савецкая педагогіка будавала адукацыйна-выхаваўчы і прафарыентацыйны працэс як кіруемы і кантралюемы, пры гэтым дасканала вызначала мэты, задачы, сродкі і формы работы.

Школа ў рамках тэхналагічнага падыходу разглядаецца як установа, якая рэгулюе паводзіны, фарміруе сацыяльныя нормы, ідэалагічныя стандарты. Такая мадыфікацыйная методыка мела бы права на існаванне, калі б яна не зводзілася да маніпулявання асобай, не грэбавала яе інтарэсамі, схільнасцямі, імкненнямі да максімальнай самарэалізацыі. У такім жа выглядзе яна мае антыгуманны характар, паколькі не накіравана на развіццё асобы, якая знаходзіцца на службе ў бездухоўнага, усепадаўляючага монстра – дзяржавы [2, с. 215].

Такім чынам, сацыяльна-педагагічная мадэль прафесійнай арыентацыі рэалізавала патрабаванні грамадства выхаваць асобу з загадзя запланаванымі якасцямі, падпарадкаваць індывідуальныя імкненні, здольнасці патрэбам дзяржавы ў кадрах. Адукацыйны працэс быў зарыентаваны на стварэнне аднолькавых умоў для ўсіх, пры якіх кожны дасягае плануемых вынікаў. Суб`ектыўны вопыт вучня, яго імкненні, як правіла, не ўлічваліся. Сутнасць такой тэхналогіі добра вызначыла псіхолаг І.С.Якіманская : “Мне не цікава, які ты сёння, але я ведаю, якім ты павінен стаць, і я гэтага даб’юся” [12]. У такім падыходзе ёсць пагроза маніпулявання асобай, небяспека фарміравання чалавека-функцыянера, бяздумнага выканаўцу чужых загадаў. У аснове тэхнакратычнай тэхналогіі ляжыць прынцып мадыфікацыі паводзін аптанта ў патрэбным накірунку. Школа разглядаецца як установа, якая рэгулюе паводзіны дзяцей і моладзі, выпрацоўвае неабходныя ўстаноўкі на жыццёвае і прафесійнае самавызначэнне.

Такім чынам, дзейнасць прафарыентацыйных служб у яшчэ большай ступені абвастрыла існуючыя супрацьлегласці.

1. Мелася на ўвазе, што стратэгічнай мэтай прафесійнай арыентацыі з`яўляецца задавальненне патрэб народнай гаспадаркі ў кадрах. Прычым, выбар прафесіі неабходна было ўвязаць з патрэбамі канкрэтнага эканамічнага раёна. Жаданні і схільнасці моладзі, як правіла, ігнараваліся, што асуджала грамадства і асобу на няўдачу. Як паказвае сусветная практыка, інтарэсы дзяржавы дэтэрмінуюцца інтарэсамі асобы: што задавальняе асобу, задавальняе і дзяржаву.
2. Як вынік, прафесійныя схільнасці, асобасныя якасці часта не адпавядалі патрабаванням прафесіі. Адсюль расчараванні, жыццёвыя трагедыі, страта сэнсу жыцця, складаны пошук новай прафесійнай траекторыі.

Пераход да новага этапу грамадскага развіцця – постіндустрыяльнага грамадства – суправаджаецца зменай прыярытэтаў:

- усё больш прыхільнікаў ахоплівае погляд на чалавека як на асобу свабодную ў выбары магчымай сферы прафесійнай дзейнасці;
- атрымлівае прызнанне прыярытэт каштоўнасцяў над мэтамі, а ў шэрагу каштоўнасцяў дастойнае месца пачынае займаць чалавечая індывідуальнасць;
- узрастае ўсведамленне адказнасці і пачуццё віны, роля катэгорый маральнасці і годнасці;
- прызнаецца парытэт асобасных і грамадскіх інтарэсаў і патрэб.

Абазначаныя сацыякультурныя тэндэнцыі адлюстроўваюцца на сістэме поглядаў на шляхі вырашэння праблемы прафесійнага выбару, абумоўліваюць змену метадалагічных асноў. Прафесійная арыентацыя пачынае разглядацца як сістэма раўнапраўнага ўзаемадзеяння асобы і грамадства, накіраваная на задавальненне патрэб асобы ў прафесійным самавызначэнні і патрэб грамадства ў забеспячэнні сваёй сацыяльна-прафесійнай структуры. Вынікам такога ўзаемадзеяння павінна стаць сфарміраванасць гатоўнасці асобы да прафесійнага самавызначэння, якая разглядаецца як здольнасць да пазнання індывідуальных асаблівасцяў (вобраз "я") і да прыняцця рашэння аб выбары [11, с. 35].

Такім чынам, пад уздзеяннем сацыякультурных умоў кардынальна пераўтвараецца і сістэма поглядаў на аналізуемую намі праблему: яна пачынае разглядацца ў кантэксце прафесійнага самавызначэння, што сведчыць аб перамяшчэнні акцэнтаў з дзяржаўна-грамадскіх патрэб на патрэбасную сферу асобы. Якасныя адрозненні аспектаў, фактараў, што вызначаюць змест падыходаў да вырашэння праблемы прафесійнага выбару на этапах індустрыяльнага і постіндустрыяльнага грамадскага развіцця, прыведзены ў табліцы 1.

***Табліца 1.***

| Аспекты | Ва ўмовах індустрыяльнага грамадства | Ва ўмовах постіндустрыяльнага грамадства |
|---|---|---|
| Метада-лагічны | Канцэпцыя грамадскага інтарэсу як галоўнага стымулу прафесійнага самавызначэння: “Чалавек для грамадства, для дзяржавы”, чалавек – вінцік у складаным гаспадарчым механізме, выканаўца, “кадр”.<br>Мэта прафесійнай арыентацыі: забяспечыць народную гаспадарку кадрамі, высокія тэмпы навукова тэхнічнага прагрэсу. Фарміраванне здольнасцяў і схільнасцяў асобы носіць другасны характар. | Пераход да новай парадыгмы грамадскага развіцця, пераарыентацыя на патрэбы асобы. Гуманізацыя грамадскіх структур. Усведамленне таго, што найбольшая каштоўнасць ад чалавека, які займаецца любімай справай. Эканамічны дабрабыт, сацыяльная стабільнасць забяспечваюцца высокай зацікаўленасцю прафесіяналаў, арганічным спалучэннем грамадскіх перспектыў з асобаснымі, поўнай аддачай любімай справе, магчымасцямі максімальнай самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці.<br>Законы рынку працы вызначаюць патрабаванні да будучага прафесіянала: мабільнасць, канкурэнтназдольнасць, высокі прафесіяналізм, ініцыятыўнасць, імкненне да разумнай рызыкі.<br>Мэта прафесійнай арыентацыі: стварэнне аптымальных умоў для раскрыцця здольнасцяў, схільнасцяў асобы, максімальнай самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці. |
| Сацыль-на-эка-намічны | Планаванне патрэб народнай гаспадаркі ў кадрах. Прыярытэт патрэб дзяржавы перад патрэбамі асобы. Дэвальвацыя такіх чалавечых каштоўнасцяў як задаткі, творчыя здольнасці, духоўнае багацце, жыццёвыя імкненні. Арыентацыя на рост інтэнсіўнасці працы. Гарантаванае права на бясплатную адукацыю і працаўладкаванне. | Пераход ад планавання патрэб у кадрах да планавання прапаноў. Грамадства зацікаўлена ў знаходжанні і рэалізацыі асобай свайго прызвання. Што добра асобе, добра і грамадству. Прыватная ўласнасць, канкурэнцыя, беспрацоўе, дыфэрэнцыяцыя ў аплаце, раздзяленне грамадства на багатых і бедных. Павелічэнне долі платных адукацыйных паслуг. Свабодная працаўладкаванне.<br>Прызнанне таго, што інтэлект і тэхналагічнае ўмельства – сапраўдная крыніца нацыянальнага багацця. |
| Псіхола-га-педа-гагічны | Школа – установа, якая рэгулюе паводзіны, фарміруе сацыяльныя нормы, ідэалагічныя стандарты і знаходзіцца на службе ў бездухоўнага, усепадаўляючага монстра—дзяржавы.<br>Галоўная задача школы: зарыентаваць выпускнікоў на выбар прафесій, у якіх у дадзены момант адчувае патрэбу народная гаспадарка, сфарміраваць асобу з загадзя запланаванымі якасцямі.<br>Арыентаванасць адукацыйнага працэсу на стварэнне аднолькавых умоў для ўсіх. Ігнараванне суб’ектыўнага вопыту вучняў. Адсутнасць індывідуальнага падыходу, аднастайнасць відаў і тыпаў вучэбных устаноў. Асоба выпускніка – аб’ект кіравання і маніпуляцый. | Школа – установа, дзе ствараюцца ўмовы для самаразвіцця, самавызначэння і самарэалізацыі асобы. Асноўная задача апярэджваючай прафесійнай адаптацыі: аказаць педагагічную падтрымку аптанту ў яго прафесійным самавызначэнні, самапазнанні і самарэалізацыі. Дыферэнцыяцыя і індывуалізацыя адукацыйнага працэсу, стварэнне інавацыйных навучальных устаноў. Прызнанне індывідуальнасці, самабытнасці, самакаштоўнасці чалавека. Прызнанне вучня галоўнай фігурай прафарыентацыйнага працэсу. Пераарыентацыя педагагічных дзеянняў на патрэбы асобы, яе індывідуальнае развіццё, фарміраванне прафесійнай самасвядомасці. |

Праведзены аналіз паказвае, што працэс прафесійнага самавызначэння мае шэраг адрозненняў, падыходаў у разуменні, ажыццяўленні, кіраванні ў розных сацыякультурных умовах. Так, метадалагічны аспект пры вызначэнні зместу прафарыентацыйнай работы ва ўмовах індустрыяльнага грамадства аддае прыярытэт інтарэсам і ідэалогіі дзяржавы. Пры пераходзе да постіндустрыяльнага этапу грамадскага развіцця ўсталёўваецца і прызнаецца парытэт дзяржаўных і асобасных патрэб.

Сацыяльна-эканамічны аспект прафесійнага самавызначэння ў адным выпадку абапіраецца на планаванне патрэб гаспадаркі ў кадрах, у другім – адбываецца пераход да планавання прапаноў адукацыйных устаноў, пабудаваных на імкненні рэалізаваць асобасныя патрэбы выпускнікоў. У псіхолага-педагагічным аспекце ва ўмовах індустрыяльнага грамадства прафарыентацыя разглядаецца як сродак уздзеяння на асобу ў мэтах фарміравання запланаваных якасцяў, ва ўмовах постіндустрыяльнага грамадства прафесійнае самавызначэнне – гэта пераарыентацыя на Я-канцэпцыю асобы, яе патрэбы, імкненні да самарэалізацыі ў прафесійнай дзейнасці, выхаванне мабільнага, канкурэнтназдольнага працаўніка.

Разам з тым, трэба мець на ўвазе, што пераход да постіндустрыяльнага грамадства яшчэ не завершаны. Прыведзеныя метадалагічныя і псіхолага-педагагічныя палажэнні ў цяперашні момант выступаюць у якасці арыенціраў, неабходных умоў для перагляду і перабудовы практыкі вырашэння праблемы выбару моладдзю сферы прафесійнай дзейнасці. Пераходны перыяд грамадскага развіцця суправаджаецца мноствам спадарожных праблем і супрацьлегласцяў.

У прыватнасці, трэба мець на ўвазе, што ў сучаснай сацыяльна-эканамічнай сітуацыі ў рэспубліцы існуе розна-

накіраванасць і разузгодненасць грамадскіх і асобасных задач адукацыі ўвогуле і прафесійнай арыентацыі ў прыватнасці. Многія віды прафесійнай дзейнасці, якія грамадства прапануе сучасным выпускнікам, не патрабуюць ад іх творчасці, унікальнасці асобасных якасцяў і арыентуюць хутчэй на стараннасць, чым на творчасць, хутчэй на абмежаванне кола інтарэсаў і дамаганняў, чым на максімальную самарэалізацыю ў дзейнасці. Ёсць, на жаль, ёсць віды прафесійнай дзейнасці, шкодныя для здароўя фізічнага і псіхічнага. Але сістэма адукацыі павінна ажыццяўляць прафесійную арыентацыю і прафесійную падрыхтоўку работнікаў для замяшчэння падобных вакансій. Прыходзіцца адступаць ад высокіх прынцыпаў гуманізму на карысць неадкладным патрабаванням, часовай эканамічнай мэтазгоднасці.

Пакуль значная частка адукаваных людзей не знаходзіць прымянення сваім магчымасцям, праца спецыялістаў ацэньваецца неадпаведным чынам, а сацыяльны рух абумоўлены не столькі ўзроўнем і якасцю адукацыі, колькі грамадскім становішчам сям'і, уплывовымі родзічамі і сваякамі і таму падобнымі фактарамі. Пакуль ажыццяўляецца сектаральны выбар паміж рознымі задачамі адукацыі, кожная з якіх значная, але адначасова вырашаць іх няма магчымасці. Прыходзіцца аддаваць перавагу сацыяльнай справядлівасці або адукацыі таленавітых, колькасным або якасным паказчыкам развіцця адукацыі, размяркоўваючы абмежаваныя рэсурсы паміж агульнай і прафесійнай адукацыяй, рознымі ўзроўнямі і тыпамі адукацыі, паміж рознымі блокамі вучэбных дысцыплін.

Прадстаўнікі розных слаёў насельніцтва неаднолькава адносяцца да агульнай і прафесійнай адукацыі. Першая характарызуецца арыентацыяй на развіццё чалавечай асобы, яе здольнасцяў, тады як прафесійная адукацыя рыхтуе чалавека да выканання спецыялізаваных відаў дзейнасці, якія неабходны грамадству. Як правіла, заможныя людзі, зацікаўлены ў высокаякаснай адукацыі, якая ў выпадку неабходнасці, забяспечвае добрую базу для атрымання прафесіі, але перш за ўсё адкрывае вялікія магчымасці асобаснага росту і самарэалізацыі, павышаючы шансы прадуктыўнага выкарыстання гэтых развітых асобасных якасцяў у індывідуальна прымальнай і сацыяльна перспектыўнай сферы дзейнасці. Людзі з нізкім дастаткам або сацыяльным статусам зацікаўлены ў хутчэйшым атрыманні прафесійнай падрыхтоўкі, якая патрабуе мінімум затрат асобасных сродкаў, але разам з тым абяцае найбольшыя сацыяльныя гарантыі і перспектывы перамяшчэння па службовай лесвіцы. У грамадстве, дзе пераважаюць малазабяспечаныя грамадзяне, нельга грэбаваць іх абгрунтаванымі сацыяльна-культурнымі запытамі, у тым ліку і адукацыйнымі. Аднак, калі сістэма адукацыі не забяспечвае адпаведную падрыхтоўку інтэлектуальнай эліты, творчасць якой мае рашаючае значэнне ў развіцці грамадства, то гэта ўскладняе вырашэнне сацыяльна-эканамічных праблем.

Такім чынам, на практыцы прыходзіцца збліжаць крайнія варыянты адукацыйных стратэгій, знаходзіць канструктыўныя кампрамісы, усведамляць пры гэтым, што прымаемыя рашэнні прыдзецца карэкціраваць у адпаведнасці з новымі мэтамі грамадскага развіцця. Жыццё патрабуе ад юнацтва пастаяннай крытычнай рэфлексіі, творчага светапогляднага і прафесійнага самавызначэння, унутранай свабоды, што дазволіць асобе канструктыўна змяняцца з улікам абставін.

Акрамя таго, патрабуюць вырашэння і супрацьлегласці, выкліканыя лавінападобнасцю сацыяльна-эканамічных змяненняў, што адбываюцца ў краіне. Да іх ліку адносяцца супрацьлегласці паміж:

- патрэбай рыначнай эканомікі ў самастойных і творчых людзях і адсутнасцю гэтых якасцяў у большасці вучняў;
- недастатковай інфармаванасцю падрастаючага чалавека пра складаны свет прафесій і педагагічнымі і нават канстытуцыйнымі патрабаваннямі асэнсавання і самастойнасці выбару прафесіі;
- патрэбай падрастаючага чалавека ў педагагічных парадах у сувязі з абдумваннем свайго прафесійнага шляху і частай адсутнасцю побач кампетэнтнага дарадчыка-прафкансультанта;
- высокімі патрабаваннямі школьнай моладзі да ўзроўню культуры на вытворчасці і рэальным узроўнем гэтай культуры ў канкрэтных сітуацыях;
- адсутнасцю ў многіх выпадках веры ва ўласныя сілы і магчымасці і неабходнасцю цвёрдай упэўненасці чалавека ў здольнасць рэалізаваць сябе ў прафесійнай дзейнасці.

Разам з тым, у складаных умовах існавання надзённых праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння, трэба памятаць аб тым, што сістэма прафесійнага самавызначэння, з аднаго боку, як і сістэма адукацыі ў цэлым, павінна вырастаць з гістарычна склаўшыхся пераемных адукацыйных парадыгм, а з другога – быць прагматычна накіраванай у будучыню, паколькі сучасныя школьнікі будуць здзяйсняць сваю траекторыю прафесійнага жыцця ў істотна новых умовах, якія адрозніваюцца ад іх сённяшняй вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Зменяцца і сацыякультурныя ўмовы, у якіх будзе адбывацца іх прафесійнае станаўленне ў параўнанні з умовамі, у якіх ажыццяўляецца развіццё сучаснага прафесіянала.

Такім чынам, прывязденне сістэмы прафесійнага самавызначэння ў адпаведнасць з патрэбамі асобы і грамадства – адна з важнейшых праблем у сферы адукацыі, якая ўзнікла ў выніку яго дэмакрытызацыі, складанасці сацыякультурных пераўтварэнняў і абмежаванасці сродкаў на іх здзяйсненне. Адной з неабходных умоў яе паспяховага вырашэння выступае выяўленне тэндэнцый вывучэння і арганізацыі працэсаў прафесійнага выбару, якія адпавядаюць накірункам цывілізацыйнага развіцця. Менавіта яны могуць скласці адэкватны метадолага-тэарэтычны базіс для выбару правільнага шляху стварэння сістэмы прафесійнага самавызначэння моладзі.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Воронин А.А. Периодизация историии и проблема определения техники // В.Ф.– 2001.– №8.– С.17-18.
2. Гершунский Б.С. Философия образования для XXI века.– М.: Совершенство, 1998.– 608 с. 3. Латыш Н.И. Образование на рубеже веков.– Минск: НИО, 1994.– 156 с.
3. Малькова Т.П., Фролова М.А. Введение в социальную философию: Учебное пособие для студентов.– М.: Междунар. пед. академия.– 1995.– 188 с.
4. О дальнейшем совершенствовании обучения и воспитания учащихся общеобразовательных школ и подготовки их к труду. Постановление ЦК КПСС и Совета Министров СССР // Собрание Постановлений правительства СССР.– 1978.– №1.– С. 8–10.
5. Прокофьев М.А. Совершенствование общеобразовательной системы в условиях научно-технической революции // Плановое хозяйство.– 1977.– № 7.– С. 30–37.
6. Сильвестров В.А. Теория и история культуры в составе образовательной деятельности // Культура, традиции, образование. Вып. 1.– М., 1990.– С. 36–48.
7. Соловьев А.В. Профессиональная ориентация в системе экономики // Советская педагогика.– 1971.– №10.– С. 34–40.
8. Федотова В.Г. Типология модернизаций и способов их изучения //В.Ф.– 2000.– №4.– С. 3-27.
9. Франкл В. Человек в поисках смысла: Сборник: Пер. с англ. и нем.– М.: Прогресс, 1990.– 366 с.
10. Чистякова С.Н., Поляков В.А. и др. Профессиональное самоопределение молодёжи // Педагогика.– 1993.– № 5.– С.33-37.
11. Якиманская И.С. Личностно-ориентированное обучение в современной школе.– М.: Сентябрь, 1996.– 96 с.